УДК 904.5(476.1)" 9/10"
DOI: 10.37445/adiu.2021.01.19

*М. А. Плавінскі*

# ДАТАВАННЕ І КУЛЬТУРНАЯ ПРЫНАЛЕЖНАСЦЬ КУРГАННАГА МОГІЛЬНІКА МІЛТЫ (МЯДЗЕЛЬСКІ РАЁН МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ)

*Курганны могільнік Мілты Мядзельскага раёна Мінскай вобласці складаецца з дзвюх груп — Мілты I і II. Даследаванні могільніка праводзіліся ў 1992—1993 гг. археалагічнай экспедыцыяй гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта на чале з В. Н. Рабцэвічам і А. М. Плавінскім. У 1992 г. было раскапана 5 курганоў у групе Мілты I, у 1993 г. — 2 курганы ў групе Мілты II. Аналіз пахавальнага інвентару і абраду даследаваных пахаванняў дазваляе сцвярджаць, што курганы ў групах I і II могільніка Мілты могуць быць датаваныя другой паловай X — першай паловай XI ст. ці некалькі шырэй — X — першай паловай XI ст., і належаць да фінальнага этапу існавання культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў на заходнім памежжы яе арэалу.*

***Ключавыя словы:*** *ранняе Сярэднявечча, Паўночная Беларусь, пахавальны абрад, пахавальны інвентар, культура смаленска-полацкіх доўгіх курганоў.*

Матэрыялы раскопак курганнага могільніка Мілты Мядзельскага раёна Мінскай вобласці былі ўведзены ў навуковы зварот у 2005 г. у сумесным артыкуле А. М. і М. А. Плавінскіх (Плавінскі, Плавінскі 2005). Неабходнасць паўторнага звароту да аналізу матэрылаў раскопак гэтага некропаля тлумачыцца, у першыую чаргу тым, што за апошнія паўтары дзесяцігоддзі, дзякуючы новым палявым даследаванням і ўвядзенню ў навуковы зварот матэрыялаў раскопак папярэдніх гадоў, існуючыя ўяўленні аб абрадзе і храналогіі пахавальных помнікаў Паўночна-Заходняй Беларусі зазналі дастаткова моцныя змены. Гэта, у сваю чаргу, вядзе да неабходнасці паўторнага звароту да аналізу асобных пахавальных помнікаў і перагляду некаторых выказаных раней высноў.

© М. А. ПЛАВІНСКІ, 2021

**Планіграфія і гісторыя вывучэння некропаля Мілты**. Могільнік Мілты складаецца з дзвюх курганных груп — Мілты I і II.

***Група Мілты I*** была выяўлена Я. Г. Зверугам. Яна знаходзіцца ў лесе ля дарогі, якая вядзе з вёскі Нагаўкі — ў вёску Дзягілі на трэцім кіламетры ад паварота на Нагаўкі, за 1,5 км на поўдзень ад Нагавак і за 0,3 км на паўночны захад ад вёскі Мілты (мал. 1). У 1992 г. да даследаванняў групы Мілты I прыступіла археалагічная экспедыцыя гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта на чале з В. Н. Рабцэвічам і А. М. Плавінскім. На момант правядзення раскопак у могільніку налічвалася 36 курганных насыпаў, з якіх 27 былі круглымі, 9 — авальнымі ў плане




**Мал. 1.** Курганны могільнік Мілты на здымку з Google




**Мал. 2.** План курганнай групы Мілты I (мал. А. М. Плавінскага)




**Мал. 3.** План курганнай групы Мілты II (мал. А. М. Плавінскага)

(мал. 2). Круглыя насыпы маюць дыяметр ад 5 да 10 м і вышыню да 1,5 м. Авальныя курганы — значна большыя па памерах і дасягаюць вышыні 2,5 м. Яны арыентаваныя па лініі поўнач—поўдзень, радзей — захад—усход. Тэрыторыя некропаля моцна зарасла лесам. Большасць курганоў была пашкоджана перакопамі і звярынымі норамі. Сляды раўчукоў вакол курганных насыпаў візуальна не прасочваліся. У 1992 г. у Мілтах I было раскапана 5 курганных насыпаў (мал. 2).

***Група Мілты II*** была выяўлена археалагічнай экспедыцыяй гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Яна знаходзіцца ў лесе, на другім кіламетры дарогі, якая вядзе з вёскі Нагаўкі ў вёску Рамашкі, за 1,3 км на паўночны ўсход ад вёскі Мілты (мал. 1). У групе налічваецца 28 насыпаў, з якіх 26 знаходзяцца з левага боку ад дарогі Нагаўкі—Рамашкі. Два курганы размяшчаюцца з правага боку ад дарогі і выходзяць далёка на захад ад сучаснай тэрыторыі могільніка (мал. 3). Помнік, напэўна, уяўляе з сябе толькі частку некалі большага па памерах могільніка. Курганы моцна зараслі лесам, на шмат якіх з іх прасочваюцца сляды рабаўнічых ямінаў. Насыпы маюць паўсферычную форму. Большасць з іх круглыя ў плане, некаторыя — некалькі выцягнуты па лініі поўнач—поўдзень з нявялікімі адхіленнямі. Круглыя курганы маюць вышыню 0,5—1,5 м пры дыяметры 5—8 м. Авальныя насыпы дасягаюць вышыні 2 м, іх схілы значна больш стромкія. Раўчукі вакол курганоў візуальна не прасочваліся. У 1993 г. В. Н. Рабцэвіч і А. М. Плавінскі рас-




**Мал. 4.** Курганны могільнік Мілты I, курган 1: 1 — план і профілі кургана (1 — карычневата-жоўты пясок; 2 — шэравата-жоўты пясок з дробнымі каменчыкамі; 3 — чырванавата-жоўты пясок; 4 — пясок з вуголлем і попелам; 5 — вуголле і карбанізаваныя плашкі; 6 — камяні; 7 — гліна; 8 — перакоп; 9 — мацярык; 10 — дзіван; 11 — кальцынаваныя косткі); 2 — планы і профілі мацерыковых ямін; 3 — глінянае праселка (1, 2 — мал. А. М. Плавінскага, 3 — мал. М. А. Плавінскага)

капалі ў курганнай групе Мілты II два пахавальныя насыпы.

У 2005 г. у публікацыі матэрыялаў раскопак некропаля Мілты аўтары артыкула выказалі меркаванне аб тым, што ён датуецца X — пачаткам XI ст. Усе пахаванні, акрамя інгумацыі ў кургане 10 групы I, належаць да культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў (летапісных крывічоў; Плавінскі, Плавінскі 2005, с. 129). Апублікаваныя матэрыялы з Мілтаў былі выкарыстаны А. В. Вайцяховічам падчас аналізу пахавальнага абраду насельніцтва Полацкай зямлі X—XII стст. У сваёй працы даследчык пагадзіўся з прапанаванымі аўтарамі публікацыі матэрыялаў раскопак інтэрпрэтацыямі асаблівасцяў пахавальнага абрада і датаваннем некропаля (Войтехович 2019, с. 123—130). Акрамя таго, дэталёвае вывучэнне пацерак з пахавальных комплексаў могільніка ў Мілтах было ажыццёўлена М. І. Латышавай (Сцяпанавай) (Степанова, Плавинский 2018).

Матэрыялы раскопак у Мілтах захоўваюцца ў зборы вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта [1].

1. Прыношу шчырую падзяку загадчыку вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта В. М. Сідаровічу за ўсебаковую дапамогу ў апрацоўцы калекцыі з раскопак курганнага могільніка Мілты.

Звернемся да апісання пахавальнага абраду і інвентру кургаоў, даследаваных у групе ***Мілты I*** у 1992 г.

<u>*Курган 1*</u> размяшчаўся ва ўсходняй частцы могільніка, за 80 м на поўдзень ад дарогі Нагаўкі—Дзягілі, ля паварота на вёску Мілты (мал. 2). Насып зарос маладымі дрэвамі. Дзве вялікія сасны раслі ля аснавання кургана з усходняга і паўночнага бакоў.

Насып авальнай формы быў выцягнуты па лініі поўнач—поўдзень, меў памер 11 × 9 м і вышыню 0,5 м (мал. 4: 1). Нейкія пашкоджанні кургана, гэтаксама як і раўчукі вакол яго, візуальна не прасочваліся, з-за чаго, на вялікі жаль, спробаў вывучэння прылеглай да насыпа тэрыторыі не ажыццяўляліся. Сам насып быў пакрыты тонкім слоем дзірвану і складаўся з карычневата-жоўтага пяску з уключэннямі попела. Усю плошчу аснавання кургана пакрываў слой пяску з попелам магутнасцю 0,1 м — верагодна, старажытны пахаваны дзірван. У гэтым слаі часта сустракаліся дробныя фрагменты кальцынаваных костак.

Мацярык складаўся з жоўтага буйназярністага пяску. У мацерыку выяўлены дзве яміны (мал. 4: 2).

*Яміна 1* знаходзілася ў паўднёва-ўсходнім сектары, была выцягнутая па лініі поўнач—поўдзень, мела памер 1,2 × 0,6 м і глыбіню 0,4 м. Запаўненне яміны складалася з пяску, перамяшанага з попелам і вугольчыкамі.







**Мал. 5.** Курганны могільнік Мілты I, курган 2: 1 — план і профілі кургана; 2 — планы і профілі мацерыковых ямін; 3 — фрагмент венца ляпной пасудзіны (1, 2 — мал. А. М. Плавінскага, 3 — мал. М. А. Плавінскага)




*Яміна 2* выяўлена ў паўднёва-заходнім сектары. Яна мела авальную форму, была выцягнутая па лініі поўнач—поўдзень, мела памер 0,6 × 0,5 м і глыбіню 0,3 м. Запаўненне яміны складалася з попелу са шматлікімі фрагментамі кальцынаваных костак, сярод якіх было выяўлена біканічнае праселка з гліны светла-шэра-карычневага колеру без слядоў знаходжання ў агні (мал. 4: 3). Дыяметр праселка — 2,8 см, яго вышыня — 1,2 см. Аналагічныя праселкі распаўсюджваюцца ў побыце насельніцтва культур лясной зоны, пачынаючы з позназарубінецкага перыяда (Лопатин, Фурасьев 2007, с. 55), хаця час іх найбольш шырокага распаўсюджання прыпадае на трэцюю чвэрць I тыс. н. э. (Михайлова 2014, с. 159; Митрофанов 1978, с. 114; Шадыра 2006, с. 80). Разам з тым, у Паўночнай Беларусі, у арэале культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў, выкарыстанне біканічных гліняных праселак працягвалася да самага канца I тыс. н. э. (Енуков 1990, с. 72) і нават да пачатку XI ст. (Плавінскі 2017, мал. 36: 5). Адпаведна, вызначыць вузкае датаванне насыпу на падставе гэтай знаходкі не ўяўляецца магчымым.

Можна меркаваць, што здзейсненае па-за межамі кургана 1 пахаванне па абрадзе крэмацыі было змешчана ў мацерыковую яміну 2, хаця выяўленне асобных кальцынаваных костак на ўзроўні старажытнай дзённай паверхні прымушае да пэўнай асцярожнасці ў інтэрпрэтацыі асаблівасцяў пахавальнага абраду. Пэўныя канструктыўныя асаблівасці будовы насыпу ў працэсе раскопак прасочаныя не былі. Гэты факт, а таксама тое, што раўчукі вакол кургана засталіся не даследаванымі, не дазваляюць рэканструяваць асаблівасці рытуальных дзеянняў, якія былі здзейснены падчас яго ўзвядзення.

Курган 2 размяшчаўся за 20 м на паўднёвы ўсход ад кургана 1 (мал. 2). Круглы ў плане насып меў дыяметр 9 м і вышыню 0,6 м (мал. 5: 1). Курган дастаткова моцна зарос дрэвамі, асабліва ў паўночна-ўсходнім сектары. Раўчукі вакол яго візуальна не прасочваліся.

Насып быў пакрыты тонкім слоем дзірвану і складаўся з карычневата-жоўтага пяску з уключэннямі попелу. Усю плошчу аснавання кургана пакрываў попельна-вугальны слой магутнасцю 0,1 м са шматлікімі дробнымі фрагментамі кальцынаваных костак. У мацерыку было выяўлена пяць ямінаў (мал. 5: 2).

*Яміна 1* размяшчалася ў цэнтры аснавання кургана. Яна мела авальную форму, была выцягнутая па лініі поўнач—поўдзень, мела памер 1,8 × 0,8 м і глыбіню 0,4 м. Запаўненне складалася з вугольчыкаў і попелу, кальцынаваныя косткі практычна адсутнічалі.

*Яміна 2* была выяўлена за 3 м на захад ад цэнтра кургана, мела круглую форму дыяметрам 0,6 м і глыбіню 0,3 м. Яна была запоўненая вуголлем, попелам і шматлікімі фрагментамі кальцынаваных костак.

*Яміна 3* размяшчалася ў паўночна-заходнім сектары, за 2 м ад цэнтра, і мела авальную форму, выцягнутую па лініі поўнач—поўдзень. Памер яміны — 0,6 × 0,4 м, глыбіня — 0,3 м, яе запаўненне складалася з попела, вуголля і кальцынаваных костак. Акрамя таго, было знойдзена некалькі фрагментаў ляпной керамікі. У фондах вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта захоўваецца толькі адно венца (мал. 5: 3). У папярэдняй публікацыі яно было інтэрпрэтаванае як фрагмент ляпной, магчыма, падпраўленай на ганчарным крузе, місы (Плавінскі, Плавінскі 2005, с. 122). Аднак, нашае ранейшае вызначэнне варта прызнаць памылковым. На самай справе, венца належала ляпной пасудзіне з добра загладжанай паверхняй. Яна мела раскрытую форму з мінімальна выяўленым плечуком і амаль вертыкальна пастаўленым і крыху адагнутым вонкі кароткім венцам, якое мела дыяметр 25 см.

*Яміна 4* была выяўлена ў паўночна-ўсходнім сектары за 1,2 м ад цэнтра, у плане мела круглую форму дыяметрам 0,5 м і глыбінёй 0,2 м. Запаўненне складалася з вугольчыкаў, попела і шматлікіх фрагментаў кальцынаваных костак.

*Яміна 5* размяшчалася за 3 м на ўсход ад цэнтра кургана і мела авальную форму, выцягнутую з поўначы на поўдзень. Дыяметр яміны — 0,8 × 0,5 м, глыбіня — 0,3 м, запаўненне — вугольчыкі, попел і шматлікія дробныя кальцынаваныя косткі.

Дадатковая інфармацыя аб асаблівасцях будовы насыпу кргана 2 утрымліваецца ў экспедыцыйным палявым дзённіку, які вёў А. М. Плавінскі (захоўваецца ў вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта). З яго можна запазычыць важны факт, які не ўвайшоў у фінальны тэкст справаздачы, а менавіта: *«На расстоянии 3 м от центра по окружности кургана идёт зольно-угольное кольцо. Мощность 0,1 м. Ширина 0,5 м. Залегает на глубине 10 см от поверхности почти под дёрном»*. Нажаль, гэтае колца не было адлюстравана на плане кургана і бачнае толькі ва ўсходнім профілі насыпу (мал. 5: 1).

Аналагічныя попельныя (на самай справе — гумусаваныя) праслойкі былі неаднаразова выяўлены падчас раскопак курганоў заходняй часткі Беларускага Падзвіння і Верхняга Павілля, якія датуюцца часам ад трэцяй чвэрці I — да пачатку II тыс. н. э.: курган 12 некропаля Наўры II Мядзельскага раёна Мінскай вобласці (Плавінскі, Плавінскі, Тарасевіч 2020), курганы 2/14 і 20 могільніка Опса і курган 5 могільніка Пагошча Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці (Плавінскі, Дучыц, Плавінскі, Шадыра 2014, с. 79, 99—101, мал. 42: 1, 55; Плавінскі 2017, с. 99, мал. 86—87, 101). Ва ўсіх пералічаных выпадках яны былі інтэрпрэтаваныя як выкладкі з кавалкаў дзірвану, якія рабіліся па краі аснавання курганоў з мэтай умацавання іх схілаў.

Паўнавартасна рэканструяваць працэс узвядзення кургана 2, на жаль, не падаецца магчымым. Упэўнена можна меркаваць толькі аб тым, што рэшткі здзейсненай па-за межамі кургана крэмацыі (ці крэмацый) былі змешчаныя ў ямінах, выкапаных у аснаванні кургана. Акрамя таго, па перыметры аснавання была зроблена выкладка з кавалкаў дзірвану, якая павінна была прадухіліць апаўзанне ўзведзенага з пяску насыпу. Нейкія іншыя асаблівасці будовы кургана, гэтаксама як і раўчукі вакол яго, у працэсе раскопак выяўлены не былі.

<u>*Курган 4*</u> размяшчаўся за 30 м на паўднёвы захад ад кургана 1 (мал. 2). Ён меў круглае ў плане аснаванне і паўсферычную форму са стромкімі схіламі і крыху сплошчанай вяршыняй (мал. 6: 1). Дыяметр кургана — 10 м, вышыня — 1 м. На ім расло некалькі вялікіх дрэваў.

Насып быў пакрыты тонкім слоем дзівану. У яго цэнтры выразна прасочваліся сляды перакопа, які не дайшоў да попельнага слою на аснаванні. Яміна мела дыяметр 2 м і глыбіню 0,5 м. Сам насып меў дастаткова складаную стрктуру. Яго верхняя частка магутнасцю 0,8 м складалася з дробназярністага карычневата-жоўтага пяску. Пад насыпам быў выяўлены слой жоўтага пяску з глінай дыяметрам 3 м і магутнасцю 0,4 м. Гэты насып некалькі змешчаны ад цэнтра кургана на поўдзень. На мяжы гэтых двух слаёў прасочваецца тонкая попельная праслойка.

Плошча аснавання кургана была пакрытая слоем пяску з вугольчыкамі і попелам магутнасцю 0,1—0,2 м. У цэнтры аснавання попельны слой набываў асабліва насычаны характар (мал. 6: 1). У цэнтры кургана на попельным слаі былі выяўлены буйныя вуголлі і плашкі, арыентаваныя па лініях поўдзень—поўнач і захад—усход. Тут жа былі знойдзены шматлікія дробныя фрагменты кальцынаваных костак (агульнай масой 398,3 г) і рэшткі пахавальнага інвентара (мал. 6: 2). У палявых умовах, а пасля ў справаздачы аб раскопках і ў папярэдняй публікацыі іх матэрыялаў, дадзеная канструкцыя была інтэрпрэтаваная як рэшткі пахавальнага вогнішча, на якім адбылося трупаспаленне на месцы ўзвядзення кургана (Плавінскі, Плавінскі 2005, с. 122). Гэтая папярэдняя інтэрпрэтацыя была ў далейшым падтрымана А. В. Вайцяховам, які, пры гэтым, адзначыў, што прыклады ажыццяўлення крэмацыі на месцы ўзвядзення кургана з'яўляюцца на тэ-




**Мал. 6.** Курганны могільнік Мілты І, курган 4: 1 — план і профілі кургана, 2 — план пахавання (1 — кругавы гаршчок; 2 — аплаўленыя пацеркі і фрагменты шыйнай грыўні; 3 — фрагменты ляпнога гаршка; 4 — аплаўленыя пацеркі; 5 — фрагменты шыйнай грыўні; 6 — нож; 7 — пярсцёнак), 3 — скапленне камянёў у паўднёва-усходнім сектары (мал. М. А. Плавінскага)

рыторыі Паўночнай Беларусі нешматлікімі (Войтехович 2019, с. 21, 24). Аднак, даводзіцца прызнаць, што прапанаванае намі раней вызначэнне дадзенай канструкцыі з'яўляецца памылковым. Найбольш верагоднай інтэрпрэтацыяй выяўленага аб'екта падаецца наступная — перад намі рэшткі пэўнай канструкцыі з драўляных плашак, якія, верагодна, былі пакладзены накатамі «крыж накрыж» і маглі ў выніку ўяўляць своеасаблівы памост. Дрэва ператварылася ў вуголле ў працэсе натуральнай карбанізацыі. На карысць такога вызначэння сведчыць, найперш, той факт, што пад вуголлем і плашкамі слядоў пракалу мацерыковай паверхні ў выніку ўздзеяння высокай тэмпературы не выяўлена. А ў выпадку, калі б трупапаленне адбывалася на месцы, мацярык у абавязковым парадку падвергся б моцнаму ўздзеянню агню. Акрамя таго, мяркуючы па дзённікавых запісах А. М. Плавінскага, кругавы гаршчок быў выяўлены *«на 0,1 м выше зольника»*. Відавочна, што гаршчок мог быць выяўлены ў насыпе ў такім становішчы толькі ў тым выпадку, калі першапачаткова ён быў змешчаны на нейкай цвёрдай паверхні, якая з цягам часу спарахнела.

Сярод карбанізаваных плашак выяўлены кальцынаваныя косткі, рэшткі аплаўленых бронзавых упрыгажэнняў і шкляных пацерак і іншы інвентар, які складаўся.

• Фрагменты моцна аплаўленага бронзавага ўпрыгажэння (упрыгажэнняў?), сярод якіх надзейна вызначаюцца фрагменты вітай трохдротавай грыўні з канічнымі канцамі (мал. 7: 1—3; табліца). Абруч грыўні меў дыяметр 0,8 см і быў звіты з драцінак дыяметрам 0,3 см. Адзін часткова захаваны канец грыўні мае дыяметр аснавання 1,4 см і вышыню — 1,2 см (першапачаткова, верагодна, дасягала 1,5 см). Шыйныя грыўні з канічнымі канцамі датуюцца ў Літве VIII—XI стст. (Lietuvos… 1977, p. 146).

• Мініяцюрны жалезны нож з прамой спінкай, пакрытага акалінай (мал. 7: 4). Агульная даўжыня нажа — 9,1 см, даўжыня ляза — 5,6 см, яго шырыня — 0,9 см, таўшчыня спінкі — 0,3 см. Нож належыць да групы І паводле Р. С. Мінасяна, які лічыў, што падобныя нажы шырока распаўсюджваюцца ў лясной зоне Усходняй Еўропы ў трэцяй чвэрці І тыс. н. э. і працягвалі выкарыстоўвацца ў VIII—XI стст. (Минасян 1980, с. 69). Нажы з прамой спінкай добра вядомыя ў старажытнасцях культуры пскоўскіх доўгіх курганоў (Михайлова 2014, с. 129—131), асобныя знаходкі паходзяць з пахавальных помнікаў культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў (Енуков 1990, с. 69—70).

• Шкляныя пацеркі, агульная колькасць якіх перавышала 60 адзінак. Сярод іх можна ідэнтыфікаваць 25 экзэмпляраў наступных тыпаў і відаў:




**Мал. 7.** Курганны могільнік Мілты I, курган 4, пахавальны інвентар: 1—3 — фрагменты шыйнай грыўні; 4 — нож; 5 — пярсцёнак; 6 — кругавы гаршчок; 7 — ляпны гаршчок (мал. М. А. Плавінскага)




**Мал. 8.** Курганны могільнік Мілты I, курган 4, пахавальны інвентар: 1—14, 16—32 — шкляныя пацеркі; 15 — касцяная пацерка (фота М. І. Латышавай)

• адна- (1 экз.) і двухчасткавыя (3 экз.) бела-чорныя падоўжнапаласатыя «лімонкі» (мал. 8: 1—3, 16, 27), якія належаць да тыпу 9 аддзела I паводле Ю. Л. Шчапавай (Щапова 1956, с. 175);

• двухчасткавая падоўжнапаласатая жоўта-карычневая «лімонка» (1 экз.; мал. 8: 4) таксама належаць да тыпу 9 аддзела I;

• двухчасткавыя «лімонкі» сіняга шкла (2 экз.) тыпу 9 аддзела I (мал. 8: 9, 24);

• двухчасткавая «лімонка» барвовага ці так званага «віннага» шкла тыпу 9 аддзела I (1 экз.), якая з прычыны аплаўленасці можа быць ідэнтыфікавана толькі з пэўнай доляй гіпатэтычнасці (мал. 8: 6, 7);

• адначасткавая лімонападобная пацерка жоўтага шкла тыпа 9 аддзела I (1 экз.), якая прыпеклася да двухчасткавай падоўжнапаласатай «лімонкі» (мал. 8: 2, 3). Акрамя гэтай больш-менш вызначальнай пацеркі, сярод знаходак прысутнічае злітак жоўтага шкла (мал. 8: 13), які, хучэй за ўсё, таксама быў класічнай «лімонкай», але зараз упэўнена сцвярджаць гэта немагчыма;

• адна-, двух- і трохчасткавыя зонныя сінія (13 экз.; мал. 8: 10—12, 14, 17—23, 25, 26), якія адпавядаюць першаму варыянту сініх

Мілты I, курган 4, элементны склад вырабаў з каляровых металаў, % *

| Мал. | Назва прадмета | Cu | Pb | Sn | Zn |
|---|---|---|---|---|---|
| 8: 3 | Канічны канец шыйнай грыўні | 79,12 | 4,42 | 10,30 | 6,16 |
| 8: 2 | Фрагмент абруча шыйнай грыўні | 83,79 | 2,60 | 11,55 | 2,07 |
| 5: 5 | Шырокасярэдзінны пярсцёнак | 81,45 | 3,60 | 9,42 | 5,53 |

* Вымярэнні праведзеныя кандыдатам фізіка-матэматычных навук, дацэнтам К. Ф. Ермаліцкай у навукова-даследчай лабараторыі нелінейнай оптыкі і спектраскапіі фізічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта на лазерным спектромеры LSS-1 (вытворчасці сумеснага беларуска-японскага прадпрыемства LOTIS Tii, г. Мінск, Беларусь).

пацерак тыпу 2 аддзела I (круглых) паводле Ю. Л. Шчапавай (Щапова 1956, с. 166);

• зонная барвовая (1 экз.; мал. 8: 8);

• вочкавая чырвоная з чорна-белым рыскавым вочкам (1 экз.; мал. 8: 5), якая належыць да тыпа 4 паліхромных пацерак паводле Ю. Л. Шчапавай (Щапова 1956, с. 177). Рабрыстая зонная сіняя дробная пацерка (1 экз.), спечаная з барвовай «лімонкай», вызначаецца з вялікай ступенню верагоднасці (мал. 8: 6, 7). Яна належыць да аддзела II паводле Ю. Л. Шчапавай (Щапова 1956, с. 175). Даследчыца не вылучае ў асобны тып зонныя рабрыстыя пацеркі, але форма іх адрозніваецца ад цыліндрычнай плаўным пераходам ад бакавой паверхні да пляцовак пры канале, таму пацерка з кургана 4 не была аднесена да тыпу 1 (цыліндрычныя) аддзела II;

• чатырнаццацігранная касцяная пацерка (1 экз.; мал. 8: 15).

Набор пацерак з пахавання ў кургане 4 можа быць датаваны дастаткова вузка. Ю. Л. Шчапава датавала манахромныя «лімонкі» (акрамя жоўтых) X — першай паловай XI ст., а падоўжнапаласатыя лімонападобныя пацеркі X — першай чвэрцю XI ст. (Щапова 1956, с. 174—175). Паводле меркавання Ю. М. Лесмана і Я. В. Фрэнкеля, выкарыстанне падоўжнапаласатых пацерак магло працягвацца да сярэдзіны XI ст. (Лесман 1984, с. 140; Френкель 2007, с. 101). У сваю чаргу, у курганным могільніку Мініна II на Кубенскім возеры сінія і вінныя лімонападобныя экзэмпляры сустракаюцца толькі ў самых ранніх пахаваннях, датаваных другой паловай X ст., а падоўжнапаласатыя «лімонкі» канцэнтруюцца ў пахаваннях, якія належаць да другой паловы X — пачатку XI ст. (Захаров, Кузина 2008, с. 186, табл. 86). Першы варыянт сініх зонных, жоўтыя лімонападобныя і чырвоная пацерка з чорна-белым вочкам датуюцца ў межах X—XI стст. (Захаров, Кузина 2008, с. 196; Щапова 1956, с. 167, 174, 178; Фехнер 1959, прил. 5, с. 204). Такім чынам, набор пацерак, выяўлены ў кургане 4, найбольш верагодна, мог сфармавацца ў межах другой паловы X — пачатку XI ст.

У попельным слаі знойдзены фрагменты ляпнога гаршка са слядамі другаснага абпалу і дэфармацыі ад уздзеяння агню (мал. 7: 7). Пры гэтым, па ступені абпалу пасудзіны, можна меркаваць, што яна не доўга знаходзілася ў пахавальным вогнішчы. Вышыня гаршка — 10,7 см, дыяметр дэфармаванага ад уздзеяння агню венца — 11,8 × 10 см, дыяметр плечукоў — 13,5 × 12,5 см, дыяметр донца — 8,4 см. Ён быў выраблены з цеста з дамешкам некалібраванай жарствы дыяметрам да 0,4 см. Гаршчок належыць да так званай керамікі з «плечуком», характэрнай для культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў (Горюнова 2016, с. 27—28; Енуков 1990, с. 83—90; Еремеев, Дзюба 2010, с. 481—485; Еремеев 2015, с. 93—99; Каменецкая 2019, с. 26—29; Пушкина 1973, с. 90—91).

Акрамя пахавальнага інвентару, які моцна пацярпеў ад уздзеяння агню, у пахаванні былі выяўлены.

• Бронзавы пласцінкавы шырокасярэдзінны пярсцёнак з незамкнёнымі канцамі (мал. 7: 5; табліца), які захаваўся ў двух фрагментах, пакрытых моцнай пацінай. Шчыток пярсцёнка пакрыты геаметрычным арнаментам у выглядзе «елачкі», яго шырыня — 1,7 см, таўшчыня — 0,1 см. Датаванне падобных пярсцёнкаў вызначаецца ў шырокіх межах другой паловы X — пачатку XIII ст. (Седова 1981, с. 129).

• На ўзроўні 0,1 м вышэй за попельны слой стаяла раннекругавая пасудзіна з канічным тулавам і моцна адагнутым вонкі s-падобным венцам без слядоў знаходжання ў агні (мал. 7: 6). Гаршчок быў вылеплены ад рукі, а пасля абточаны па ўсёй вышыні на крузе, яго вышыня — 12,1 см, дыяметр венца — 14,6 × 15,2 см, дыяметр плечукоў — 14 см, дыяметр донца — 8,5 × 8,7 см. Па плечуку і тулаву ён упрыгожаны няроўным лінейным і хвалістым арнаментам. На донцы маецца ярка выяўлены борцік, кляймо ў выглядзе круга, а таксама сляды расколінаў, якія меліся на падстаўцы. Пасудзіна была выраблена з цеста з дамешкам некалібраванай жарствы дыяметрам да 0,4 см, абпал — нераўнамерны. Гаршчок знаходзіць аналогіі сярод раннекругавой керамікі з Гнёздава (другая палова X ст.; Каменецкая 2019, с. 36—37, рис. 19: 3), Гарадка на Ловаці (пачынаючы з другой — трэцяй чвэрці X ст. (Горюнова 2016, с. 29—30), курганных старажытнасцях Полацкай зямлі (Штыхаў 1992, мал. 67: 1, 2; Штыхов 1992, с. 62, рис. 1). Пытанне аб часе распаўсюджання кругавой керамікі ў курганных могільніках

заходняй частцы Беларускага Падзвіння і ў Верхнім Павіллі дагэтуль застаецца адкрытым. М. У. Малеўская-Малевіч лічыла, што ў гарадах Беларускага Панямоння кругавая кераміка распаўсюджваецца ў другой палове X ст. (Малевская-Малевич 2005, с. 132—137). І. І. Ерамееў лічыць, што час з'яўлення кругавога посуду ў Полацка-Віцебска-Смаленскім рэгіёне можа быць вызначаны ў межах другой чвэрці — сярэдзіны X ст. (Еремеев 2015, с. 524). Разгляд пытання аб часе з'яўлення кругавой керамікі ў курганных могільніках богінска-дрывяцкага мікрарэгіёна на захадзе Браслаўскага Паазер'я прывёў аўтара да высновы, аб тым, што посуд, выраблены на крузе, з'яўляецца ў пахаваннях дадзенага мікрарэгіёна ў канцы X ст. (Плавинский 2011, с. 272). Меркаванне аб тым, што кругавая кераміка распаўсюджваецца ў курганных пахаваннях на тэрыторыі Полацкай зямлі з канца X ст., прытрымліваецца і А. В. Вайцяховічам (Войтехович 2019, с. 85—86).

У паўднёва-ўсходнім сектары, за 0,5 м ад падэшвы кургана, на попельным слаі была выяўлена прамавугольная выкладка з буйных камянёў, крыху выцягнутая па лініі поўнач—поўдзень (памер — 0,5 × 0,4 м).

Такім чынам, на падставе выяўленага пахавальнага інвентару датаванне кургана 4 можа быць акрэслена ў межах канца X — пачатку XI ст. (ніжняя хcraналагічная мяжа вызначаецца на падставе кругавой пасудзіны, верхняя — паводле наяўнасці падоўжнапаласатых «лімонак»).

Нягледзячы на тое, што наяўнае апісанне стратыграфіі насыпа дастаткова схематычнае, і той факт, што раўчукі вакол яго не даследаваліся, рэкаструяваць асноўныя этапы яго ўзвядзення ўсё ж можна. Рэшткі здзейсненага па-за межамі кургана пахавання па абрадзе крэмацыі (мал. 9). былі змешчаны на драўлянай канструкцыі на аснаванні. Гэтая канструкцыя, верагодна, складалася з некалькіх накатаў плашак ці бярвенцаў. Пасля высыпання рэшткаў крэмацыі над драўлянай канструкцыяй ажыццяўляліся пэўныя рытуальныя дзеянні — пры пахаванні быў змешчаны кругавы гаршчок і пакладзены пярсцёнак. Пасля гэтага над пахаваннем быў узведзены невысокі (0,4 м) насып дыяметрам 3 м. Праз пэўны час, які, верагодна, быў дастаткова працяглым, бо на першапачатковым насыпе паспеў утварыцца слой дзірвану, прасочаны ў выглядзе тонкай попельнай праслойкі, узвядзенне кургана было працягнута. На паўднёвы ўсход ад першапачатковага насыпу была зроблена прамавугольная выкладка з буйных камянёў. Пасля гэта курган быў дасыпаны такім чынам, што новы, значна большы па памерах, насып перакрыў і першапачатковы курган, і каменную выкладку побач з ім.



**Мал. 9.** Курганны могільнік Мілты I, курган 4, рэканструкцыя пахавальнага строю (мал. В. М. Тарасевіч)

<u>*Курган 10*</u> размяшчаўся за 15 м на захад ад кургана 1 (мал. 2). Паўсферычны круглы ў плане насып пры дыяметры 6 м меў стромкія схілы і вышыню 1 м (мал. 10: 1). На вяршыні кургана прасочвалася невялікая яміна памерам 0,4 × 0,4 м. На схілах расло некалькі вялікіх дрэваў.

Насып быў пакрыты тонкім слоем дзірвану і складаўся з карычневата-жоўтага пяску. Яміна ў ім даходзіла да глыбіні 0,5 м ад вяршыні. Усю плошчу аснавання кургана пакрываў попельна-вугальны слой магутнасцю ад 0,1 м у цэнтры да 0,2 м па краях (мал. 10: 1).

У цэнтры аснавання на попельным слаі было здзейснена пахаванне па абрадзе інгумацыі. Нябожчык ляжаў на спіне, галавой на паўднёвы ўсход, рукі выцягнутыя ўздоўж цела (мал. 10: 1, 2). Пры пахаванні выяўлены.

• Надзвычай моцна каразіраваны жалезны нож (мал. 10: 3). Наяўная даўжыня — 9,7 см, даўжыня ляза — 5,9 см, шырыня ляза — 1,3 см, таўшчыня спінкі — 0,4 см. Нож належыць да групы II паводле Р. С. Мінасяна. Нажы гэтага тыпу складаюць пераважную большасць знаходак на паселішчах і ў могільніках на тэрыторыі Верхняга Падняпроўя і Паўночнага Захаду Расіі і ў іншых рэгіёнах лясной зоны Усходняй Еўропы, пачынаючы з X—XI стст. (Минасян 1980, с. 70).

• Рэшткі ляпной асіметрычнай пасудзіны, ад якой захаваліся прыдонная частка са сценкамі, фрагменты плечукоў і венца (мал. 10: 4). Дакладна вызначыць вышыню, дыяметр венца і плечукоў не падаецца маг-




**Мал. 10.** Курганны могільнік Мілты I, курган 10: 1 — план і профілі кургана; 2 — план пахавання па абрадзе інгумацыі; 3 — жалезны нож; 4 — ляпны гаршчок (1, 2 — мал. А. М. Плавінскага, 3, 4 — мал. М. А. Плавінскага)

чымым, але прыкладныя памеры наступныя: вышыня — каля 11,3—11,5 см, дыяметр венца — каля 9,5—10 см, дыяметр плечукоў — каля 11—11,5 см. Дакладна можна вызначыць толькі дыяметр донца — 9,3 см. Пасудзіна была вылеплена з цеста з дамешкам некалібраванай жарствы дыяметрам да 0,3 см. На донцы маюцца сляды падсыпкі з пяску з некалібраванай жарствой. Нягледзячы на стан захаванасці гаршка, яго можна ўпэўнена аднесці да керамікі з «плечуком», выкарыстанне якой у пахавальным абрадзе насельніцтва заходніх рэгіёнаў Полацкай зямлі магло працягвацца да сярэдзіны XI ст. (Плавинский 2018, с. 336—338; Войтехович 2019, с. 84—85). Адпаведна, датаванне кургана 10 можа быць вызначана ў межах першай паловы — сярэдзіны XI ст.

Рэканструяваць рытуальныя дзеянні, якія ажыццяўляліся падчас узвядзення кургана, можна наступным чынам: цела было пакладзена на аснаванне будучага насыпу галавой на паўднёвы ўсход, побач з целам паставілі ляпны гаршчок, пасля чаго над нябожчыкам быў узведзены пахавальны насып.

*Курган 13* размяшчаўся за 45 м на паўднёвы захад ад кургана 1 (мал. 2). Паўсферычны круглы ў плане насып меў дыяметр 6 м меў стромкія схілы і вышыню 1 м (мал. 11: 1). На схілах расло некалькі магутных і шмат дробных дрэваў, акрамя таго на паўднёвым схіле прасочваліся рэшткі яміны.

Насып быў пакрыты тонкім слоем дзірвану і складаўся з карычнevата-жоўтага пяску. У паўночна-заходнім сектары, ля самай вяршыні, на глыбіні 0,1 м ад яе (пад дзірванам) выяўлена авальная лінза попелу, вугольчыкаў і шматлікіх дробных кальцынаваных костак, выцягнутая па лініі поўнач—поўдзень. Лінза мела памер 0,6 × 0,3 м і магутнасць 0,2 м (мал. 11: 1).

У пахаванні былі знойдзены.

• У цэнтры лнізы выяўлены фрагменты раннекругавой пасудзіны са слядамі мінімальнага другаснага абпалу. Захаваліся значны фрагмент донца, фрагмент плечука з лінейным і хвалістым арнаментам і дробны фрагмент венца (мал. 11: 5). На падставе наяўных фраментаў можна вызначыць толькі дыяметр донца — 9 см і прапанаваць графічную рэканструкцыю агульнага выгляду гаршка, які быў вылеплены ад рукі, а пасля абточаны па ўсёй вышыні на крузе. Пасудзіна была зроблена з цеста з дамешкам жарствы дыяметрам да 0,2 см, на донцы маюцца сляды борціка. Як ужо было адзначана, з’яўленне кругавой керамікі ў курганах рэгіёна прыпадае на канец X ст.

• Дробныя зліткі бронзы [1] і сплаўленыя з кальцынаванымі косткамі рэшткі шкляных пацерак, сярод якіх вызначаецца толькі адзін чорны экзэмпляр з белай паласой (мал. 11: 2). Такія пацеркі даследчыкі датуюць X — пачаткам XI ст. (Захаров, Кузина 2008, с. 196; Самойлович 2006, с. 377—378).

1. Тут і далей тэрмін «бронза» з’яўляецца ўмоўным, бо колькасны аналіз складу металу не ажыццяўляўся.




**Мал. 11.** Курганны могільнік Мілты I, курган 13: 1 — план і профілі кургана; 2—4 — сплаўленыя з кальцынаванымі косткамі шкляныя пацеркі; 4 — графічная рэканструкцыя кругавога гаршка (1 — мал. А. М. Плавінскага, 2—4 — фота М. І. Латышавай, 5 — мал. М. А. Плавінскага)

Нягледзячы на нешматлікасць наяўных знаходак, на іх падставе датаванне кургана можы быць вызначана ў межах канца X — пачакту XI ст.

Пад насыпам быў выяўлены попельна-вугальны слой, які пакрываў усю плошчу аснавання. Яго магутнасць складала ад 0,1 м у цэнтры да 0,2 м ля падэшвы (мал. 11: 1).

Пад попельным слоем, у цэнтры аснавання кургана, у мацерыку была выяўлена блізкая да авальнай яміна, выцягнутая па лініі поўнач—поўдзень. Яна мела памер 1,5 × 0,8 м і глыбіню 0,3 м. Запаўненне складалася з пяску з попелам. Кальцынаваных костак ні ў попельным слаі на аснаванні, ні ў яміне не знойдзена.

Нягледзячы на тое, што раўчукі вакол кургана не даследаваліся, можна наступным чынам рэканструяваць рытуальныя дзеянні, якія ажыццяўляліся падчас яго ўзвядзення. Першапачаткова па цэнтры аснавання была выкапана вялікая авальная яміна. На жаль, функцыянальнае прызначэнне гэтага аб'екта засталося не высветленым падчас раскопак. Пасля гэтага быў узведзены насып, на вяршыні якога былі змешчаны рэшткі пахавання па абрадзе крэмацыі. Упэўнена сказаць, як менавіта змяшчаліся рэшткі крэмацыі, здзесненай на баку, на падставе наяўных звестак, дастаткова цяжка. Аднак, мяркуючы па тым, што лінза кальцынаваных костак мела адносна невялікі памер (0,6 × 0,3 м) пры магутнасці 0,2 м, пахаванне магло першапачаткова змяшчацца ў неглыбокай яміне на вяршыні. Паводле ступені захаванасці фрагментаў кругавога гаршка, можна меркаваць, што ён быў пастаўлены пры пахаванні, ад чаго яго верхняя частка захавалася значна горш, чым донца. Не выключана таксама, што фактычна «прыкапаная» на вяршыні крэмацыя магла быць маркіравана нейкай адмысловай канструкцыяй з арганічных матэрыялаў. Аднак, гэтае меркаванне застаецца выключна гіпатэтычным.

У курганнай групе ***Мілты II*** у 1993 г. было даследава 2 пахавальныя насыпы.

*Курган 1* размяшчаўся ў заходняй частцы некропаля (мал. 3) ля дарогі Нагаўкі—Рамашкі—Дзягілі. Насып правільнай паўсферычнай формы быў круглым у плане і пры вышыні 1,2 м меў дыяметр 8 м (мал. 12: 1). Паўднёва-ўсходні схіл больш пакаты, чым паўночна-заходні. На вяршыні кургана прасочвалася невялікая западзіна, акрамя таго, на ім расло некалькі магутных дрэваў. Раўчукі вакол кургана візуальна не прасочваліся, з-за чаго, на вялікі жаль, спробаў іх вывучэння не ажыццяўляліся.

Насып меў складаную структуру і складаўся з двух слаёў. Верхні слой магутнасцю 0,6 м складаўся з карычневата-жоўтага пяску з уключэннем дробных каменчыкаў, ніжні — магутнасцю 0,4 м — з шэравата-жоўтага пяску. Гэтыя слаі падзяляла тонкая попельная (гумусаваная) праслойка таўшчынёй 0,02 м (мал. 12: 1). У паўднёвай час-




**Мал. 12.** Курганны могільнік Мілты II, курган 1: 1 — план і профілі кургана; 2 — план і профілі пахавання 2 у мацерыковай яміне (1, 4 — фрагменты ляпнога гаршка; 2 — злітак метала; 3 — гузік; 5 — фрагмент фібулы; 6 — абойміца; мал. А. М. Плавінскага)




**Мал. 13.** Курганны могільнік Мілты II, курган 1, пахавальны інвентар: 1 — фрагмент бронзавай падковападобнай фібулы; 2 — гузік; 3 — бясформенны злітак метала; 4 — ляпны гаршчок (частковая графічная рэканструкцыя); 5 — абойміца (1, 5 — мал. В. Г. Беляўца, 2 — мал. А. М. Плавінскага, 3, 4 — мал. М. А. Плавінскага)

тцы насыпу паміж верхнім і ніжнім слаямі выяўлена лінза чырванавата-жоўтага пракаленага пяску, якая мае авальную форму памерам 5,5 × 4 м, выцягнутую з поўначы на поўдзень, і магутнасць 0,1 м. На ёй знаходзілася пахаванне — выцягнутае з поўначы на поўдзень скапленне вуглёў, попелу і кальцынаваных костак памерам 4 × 2 м і магутнасцю 0,1 м — *пахаванне 1.* У паўночнай частцы скаплення кальцынаваных костак (мал. 12: 1) былі знойдзены.

• Фрагменты ляпнога гаршка з «плечуком», які моцна пацярпеў ад удзеяння пахавальнага агню. Асабліва моцна пацярпела верхняя частка пасудзіны — фрагменты венца дэфармаваныя. Аднак, нягледзячы на сур'ёзную ступень дэфармацыі значнай часткі фрагментаў пасудзіны, усё ж можна зрабіць яе графічную рэканструкцыю (мал. 13: 4) і прыблізна вызначыць першапачатковыя памеры: вышыня — каля 11,3 см, дыяметр венца — каля 10,2 см, дыяметр плечукоў — каля 11,6 см, дыяметр донца — каля 8,3 см. Гаршчок быў выраблены з цеста з дамешкам некалібраванай жарствы дыяметрам да 0,5 см.

• Бясформенны злітак метала шэрага колеру (мал. 13: 3).

• Фрагмент, каля 1/2 часткі, масіўнай літай бронзавай спіралеканечнай фібулы

(мал. 13: 1), першапачатковы дыяметр якой дасягаў каля 6,8—7 см. Шасцігранная ў сячэнні дужка памерам 0,9 × 0,6 см пакрытая арнаментам у выглядзе «воўчага зуба». Варта адзначыць, што хоць прадмет і пабываў у пахавальным вогнішчы, пацярпеў ён ад гэтага мінімальна. Фібулы з аналагічным афармленнем дужак і гранёнымі альбо спіралеканчэнымі канцамі лічацца агульнабалтыйскім тыпам мужчынскіх упрыгажэнняў і датуюцца ў межах IX — пачатку XI ст. (Arbman 1943, taf. 53—54; Нукшинский... 1957, табл. VII: 14—16; Thunmark-Nulén 1998, taf. 77: 7—9, 81—84; Blujienė 1999, pav. 57: 1, 58: 3—6; Хвощинская 2004, с. 82—83; Еремеев 2015, с. 389), а на старажытнарускай тэрыторыі — другой паловы X — пачатку XI ст. (Мальм 1967, с. 155, 161; Авдусина, Ениосова 2001, с. 97—98).

• Бронзавы шарападобны гузік (мал. 13: 2) [1].

На падставе выяўленага інвентару, пахаванне можа быць дастаткова ўпэўнена інтэрпрэтаванае як мужчынскае і датаванае другой паловай X — пачаткам XI ст.

Аснаванне кургана пакрываў слой шэрага пяску з вугольчыкамі і попелам магутнасцю 0,1 м (мал. 12: 1). У працэсе зачысткі мацерыка, бліжэй да паўночнага краю аснавання насыпу была знойдзена бронзавая, магчыма, паясная абойміца са слядамі дэфармацыі ад знаходжання ў агні, верагодна, зробленая з другасна выкарыстанай (згорнутай удвая) арнаментаванай пласцінкі (мал. 13: 5). Пласцінка шырынёй 1,5—1,6 см і таўшчынёй 0,1 см была пакрытая арнаментам, які складаецца з двух шэрагаў трохвугольнікаў, кожны з якіх утвораны трыма кропкамі. На абойміцы захавалася адна заклёпка, маецца яшчэ тры адтуліны для заклёпак. Вузкае датаванне прадмета вызначыць не падаецца магчымым, але мяркуючы па арнаменце, ён можа быць аднесены да эпохі вікінгаў.

У аснаванні кургана, амаль у яго цэнтры была выяўлена яміна 1 круглай формы дыяметрам 0,8 м і глыбінёй 0,4 м, запоўненая вуголлем, попелам і кальцынаванымі косткамі — *пахаванне 2* (мал. 12: 2).

Рэканструяваць рытуальныя дзеянні, якія ажыццяўляліся падчас узвядзення кургана, можна наступным чынам: першапачаткова ў цэнтры аснавання будучага кургана была выкапана акруглая яміна, куды змясцілі рэшткі здзейсненай на баку безынвентарнай крэмацыі. Выяўленне ля паўночнага краю аснавання насыпу абойміцы са слядамі дэфармацыі ад знаходжання ў агні сведчыць аб ажыццяўленні нейкіх рытуальных дзеянняў на месцы насыпання будучага кургана. Пасля гэтага быў узведзены пляскаты насып вышынёй 0,4 м. Праз пэўны час, за які курганны насып паспеў пакрыцца слоем дзірвану (гумусаваная праслойка магутнасцю 2 см), на яго вяршыні было здзейснена новае пахаванне па абрадзе крэмацыі. Верагодна, крэмацыя адбылася на месцы, аб чым сведчыць той факт, што практычна ўся плошча паверхні першапачатковага кургана падвергласся ўздзеянню моцнага агню. На карысць думкі аб здзяйсненні крэмацыі на вяршыні першапачатковага насыпу, сведчыць і памер скаплення вуголля, попелу і кальцынаваных костак. А. М. Плавінскі нават меркаваў, што падчас крэмацыі цела нябожчыка было арыентаванае галавой на поўнач (Плавінскі, Плавінскі 2005, с. 128), аднак, падстаў для пацвярджэння ці абвярджэння такой гіпотэзы мы ў рэчаіснасці не маем. Пасля здзяйснення крэмацыі на вяршыні першапачатковага пляскатага насыпу курган быў дасыпаны і атрымаў сваю канчатковую форму.

<u>*Курган 2*</u> размяшчаўся за 100 м на паўночны захад ад кургана 1 (мал. 3). Ён меў паўсферычную форму з акруглым некалькі выцягнутым па лініі паўночны захад—паўднёвы ўсход аснаваннем памерам 12 × 9 м. Насып меў стромкія схілы і вышыню 1,9 м (мал. 14). Раўчукі вакол кургана візуальна не прасочваліся.

Курган быў насыпаны з карычневата-жоўтага пяску з дробнымі каменчыкамі. У насыпе, на глыбіні 0,9 м ад вяршыні прасочвалася лінза чырванавата-жоўтага пракаленага пяску памерам 5 × 3 м, выцягнутая па лініі паўночны-захад — паўднёвы-ўсход, якая мела магутнасць 0,1—0,2 м. На ёй было выяўлена пахаванне па абрадзе крэмацыі, якое ўяўляла з сябе попельна-вугальную пляміну з кальцынаванымі косткамі дыяметрам 1,4 × 1 м і магутнасцю 0,1 м — *пахаванне 1.* Гэтая пляміна была некалькі ссунута да паўночнаўсходняга краю лінзы пракаленага пяску. Арыентацыя і форма як лінзы пракаленага пяску, так і пляміны пахавання адпавядалі арыентыроўцы і форме насыпа кургана. Пад лінзай пяску і над ёй былі прасочаныя тонкія слаі попелу (гумусу), які выходзілі па-за яе межы (мал. 14).

У паўночна-ўсходняй частцы пахавання былі выяўлены.

• Фрагменты ляпнога гаршка з «плечуком», які моцна пацярпеў ад удзеяння пахавальнага агню. Асабліва моцна пацярпела верхняя частка пасудзіны — фрагменты сценак і венца дэфармаваныя і ашлакаваныя да порыстага стану. Аднак, нягледзячы на ступень пашкоджанасці, усё ж можна прапанаваць графічную рэканструкцыю дадзенай пасудзіны (мал. 15: 2), якая мела вышыню каля 13,5 см, дыяметр венца — каля 16,4 см, дыяметр плечукоў — каля 17,5 см, дыяметр

1. Дадзены артэфакт не захаваўся, што не дазваляе апісаць яго марфалагічныя асаблівасці.




**Мал. 14.** Курганны могільнік Мілты II, курган 2: 1 — план і профілі; 2 — план пахавання 1 (1 — фрагменты ляпнога гаршка; 2 — фрагменты фібулы; 3 — гузік; 4 — спражка; 5 — жалезная пласцінка; мал. А. М. Плавінскага)




**Мал. 15.** Пахавальны інвентар: 1 — фрагмент бронзавай падковападобнай фібулы; 2 — ляпны гаршчок (частковая графічная рэканструкцыя); 3 — жалезная спражка; 4 — брозавы гузік; 5 — жалезная пласцінка (мал. М. А. Плавінскага)

донца — каля 12 см і была выраблена з цеста з дамешкам некалібраванай жарствы дыяметрам да 0,6 см.

• Моцна аплаўленыя фрагменты масіўнай падковападобнай фібулы, якая мела сплошчана-шасціграннную ў сячэнні дужку з увагнутымі верхняй і ніжняй плашчынямі памерам 1,2 × 0,5 см (мал. 15: 1). Захаваліся тры вызначальныя фрагменты дужкі, да адной з якіх прыпекліся рэшткі язычка, і некалькі

зусім дробных надзвычай моцна аплаўленых фрагментаў дужкі і язычка. Нягледзячы на стан захаванасці прадмета, можна меркаваць, што як і ў выпадку з экзэмплярам з кургана 1, дадзеная фібула можа быць аднесеная да агульнабалтыйскіх тыпаў.

• Жалезная спражка з рамкай чатырохвугольнай формы з некалькі ўвагнутымі бакамі са слядамі знаходжання ў агні (мал. 15: 3). Даўжыня рамкі — 4,3 см, шырыня — 3,8—4,3 см. У сячэнні рамка пераходзіць з круглай ў прамавугольную. Даўжыня блізкага да пяцівугольнага ў сячэнні язычка — 4,9 см. Аналагічныя спражкі былі шырока вядомыя практычна па ўсёй тэрыторыі Усходняй Еўропы на працягу доўгага часу (Михайлова 2014, с. 44—45). Часта сустракаюцца яны і ў старажытнасцях культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў (Енуков 1990, с. 66).

• Бронзавы цэльналіты грушападобны гузік з вушкам (мал. 15: 4). Вышыня прадмета — 1,7 см, дыяметр — 1 см. Адзінага погляду на пытанне аб часе распаўсюджання і шляхах пранікнення ў рэгіёны Падняпроўя і Падзвіння вопраткі, якая зашпільвалася на падобныя гузікі, пакуль не выпрацавана. Разам з тым, К. А. Міхайлаў дастаткова надзейна абгрунтаваў думку аб тым, што ў старажытнарускіх пахавальных комплексах гузікі з'яўляюцца не раней за сярэдзіну X ст. (Михайлов 2016a, с. 116—120; 2016b, с. 415—427).

• Фрагмент жалезнай невызначальнай пласцінкі таўшчынёй 0,05 см (мал. 15: 5), са слядамі знаходжання ў агні, якая захавалася ў чатырох кавалках, два з якіх зусім дробныя.

На падставе выяўленых знаходак, можа выказаць меркаванне, што пахаванне было здзейснена ў межах сярэдзіны X — сярэдзіны XI ст.

Усю плошчу аснавання кургана пакрываў слой шэрага пяску з вугольчыкамі і попелам магутнасцю 0,1 м. Ля паўночна-ўсходняй падэшвы насыпу, за 6 м ад яго ўмоўнага цэнтра была выяўлена акруглая яміна дыяметрам каля 1 м і глыбінёй 0,25 м, запоўненая вугольчыкамі, попелам і шматлікімі кальцынаванымі косткамі — ***пахаванне 2*** (мал. 14).

Рэканструкцыя рытуальных дзеянняў, якія былі ажыццёўлены падчас узвядзення кургану, можа выглядаць наступным чынам: спачатку ля паўночна-ўсходняга краю будучага насыпу ў мацерыковую яміну былі змешчаны рэшткі пахавання 2 — крэмацыі, здзейсненай на баку. Пасля гэтага быў узведзены першапачатковы пляскаты насып вышынёй каля 0,9 м. Праз пэўны час, за які курганны насып паспеў пакрыцца слоем дзірвану (гумусаваная праслойка), на яго вяршыні было здзейснена новае пахаванне па абрадзе крэмацыі. У адрозненне ад кургана 1, у дадзеным выпадку мы не можам упэўнена меркаваць, адбылася крэмацыя на месцы, ці на баку. З аднаго боку, наяўнасць лінзы пракаленага пяску сведчыць на карысць магчымасці здзяйснення крэмацыі на вяршыні насыпу. З другога, адносна невялікі памер пляміны кальцынаваных костак прымушае да асцярожнага падыходу да вырашэння дадзенага пытання. Як бы там ні было, пасля здзяйснення крэмацыі на вяршыні першапачатковага насыпу, верагодна, прайшоў яшчэ пэўны час, за які курган паспеў пакрыцца новым слоем дзірвану, і толькі пасля гэтага ён быў дасыпаны і атрымаў сваю канчатковую форму.

**Датаванне і культурная прыналежнасць некропаля Мілты**. Датаванне даследаваных у Мілтах пахаванняў можа быць супольна акрэсленае ў межах другой паловы X — першай паловы XI ст. Пры гэтым, нельга выключаць і магчымасць некалькі больш шырокага датавання асобных пахаванняў — у межах X — першай паловы XI ст. Наяўнасць ляпнога пахавальнага посуду з «плечуком» дазваляе ўпэўнена аднесці некропаль да старажытнасцяў культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў (КСПДК). Дадзеная культура атаясамліваецца сёння з супольнасцю славян, вядомай у пісьмовых крыніцах, як крывічы. КСПДК фармуецца ў Смаленскім Падняпроўі і, верагодна, у паўночна-ўсходніх рэгіёнах Беларусі не пазней за сярэдзіну VIII ст. (Нефёдов 2000, с. 197; Шмидт 2012, с. 60—61). Межы распаўсюджання помнікаў КСПДК на поўначы дасягаюць рэк Вялікая і Ловаць, на ўсходзе даходзяць да вярхоўяў Вопі (правы прыток Дняпра), на поўдні пралягаюць ад вярхоўяў Сажа праз басейн Беразіны Дняпроўскай да вярхоўяў Віліі, на захадзе ідуць ад возера Нарач да возера Дрысвяты (Енуков 1990, с. 15—16; Плавінскі 2020, с. 12).

Зыходзячы з наяўных на сённяшні дзень дадзеных, можна меркаваць, што КСПДК фармуецца ў Смаленскім Падняпроўі. Асноўным імпульсам для яе ўзнікнення стала пранікненне ў дадзены рэгіён паўднёвага славянскага насельніцтва (Енуков 1990, с. 178), верагодна, з Сярэдняга Падняпроўя (Нефёдов 2000, с. 197; Енуков 2018, с. 75—77). У далейшым, галоўным накірункам рассялення крывічоў становіцца рух на захад, вынікам чаго стала паступовае зясяленне ўсяго Беларускага Падзвіння і сумежных рэгіёнаў вярхоўяў Бярэзіны Дняпроўскай і вярхоўяў Віліі. Для дэталёвай характарыстыкі дынамікі крывіцкай экспансіі ў Паўночнай Беларусі дадзеных пакуль не дастаткова, аднак, можна меркаваць, што заходніх межаў свайго рассялення крывічы дасягаюць недзе ў IX ст. (Енуков 1990, с. 178; Плавінскі 2020, с. 14).

Прычыны пашырэння арэалу КСПДК у заходнім кірунку застаюцца яшчэ не да канца зразумелымі. Магчыма, адной з іх мог




**Мал. 16.** Курганны могільнік Мілты і арэал культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў на мапе Усходняй Еўропы

быць натуральны рост колькасці насельніцтва. Разам з тым, на працягу X ст. колькасць помнікаў КСПДК у Беларускім Падзвінні і ў сумежных рэгіёнах вярхоўяў Бярэзіны і Віліі няўхільна расце. Верагодна, дадзены феномен можа тлумачыцца не толькі і не столькі натуральным прыростам насельніцтва, але і прытокам новых груп крывічоў з усходу. Прычынай новай мяркуемай хвалі перасоўвання крывічоў на захад маглі стаць дзяржаватворчыя працэсы, якія праходзілі ў Смаленскім Падняпроўі, а менавіта, узнікненне і станаўленне Гнёздаўскага раннегарадскога паселішча, якое стала цэнтрам фарміравання раннедзяржаўнай структуры ў гэтым рэгіёне. В. С. Няфёдаў мяркуе, што старажытнарускае насельніцтва Гнёздава аказвала сур’ёзны ваенна-адміністратыўны ціск на крывічоў, якія вымушаны былі забяспечваць гэты буйны гандлёва-рамесны цэнтр прадуктамі харчавання і іншымі неабходнымі таварамі. Пры гэтым, для насельніцтва КСПДК абмен з жыхарамі Гнёздава быў неэквівалентным і, верагодна, ажыццяўляўся пад ціскам ваенізаванага насельніцтва горада. Такі стан спраў прывёў да таго, што на працягу першай паловы X ст. насельніцтва КСПДК на адлегласці 40—50 км ад Гнёздава рэзка скарачаецца, калі не знікае зусім (Нефёдов 2012, с. 100).

Не выключана, што частка верхнедняпроўскіх крывічоў, ратуючыся ад уціску, сыходзіла на захад — у рэгіён Беларускага Падзвін-

 ISSN 2227-4952 (Print), ISSN 2708-6143 (Online). Археологія і давня історія України, 2021, вип. 1 (38)

ня, яшчэ не ўключаны ў арбіту фармавання дзяржавы Рурыкавічаў. Аднак і тут яны не маглі схавацца ад ціску раннедзяржаўнага аб’яднання, цэнтрам фармавання якой у заходняй частцы крывіцкага арэала стаў Полацк. Актывізацыя працэса станаўлення дзяржаўнага цэнтра ў Полацку прыпадае на час каля сярэдзіны X ст. і, верагодна, звязана са з’яўленнем тут Рагвалода (Еремеев 2015, с. 92, 101, 120; Плавінскі 2020, с. 16).

Датаванне даследаваных у Мілтах курганоў супадае па часе з акрэсленымі працэсамі, што, відавочна, выявілася і ў наборы пахавальнага інвентару некропаля. Увогуле, перыяд другой паловы X — пачатку/першай паловы XI ст. для культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў у заходняй частцы яе арэалу можа быць акрэслены як фінальны этап яе існавання. Прыкладна з сярэдзіны — другой паловы X ст. у пахаваннях заходніх рэгіёнаў рассялення носбітаў КСПДК з’яўляюцца ў прыкметнай колькасці шкляныя пацеркі, ювелірныя ўпрыгажэнні і прадметы побыту старажытнарускіх тыпаў. З’яўленне гэтых навацый у матэрыяльнай культуры і пахавальным інвентары мясцовага насельніцтва сведчыць аб усталяванні кантактаў з гарадскімі цэнтрамі (цэнтрам), якія былі адначасова і цэнтрамі фармавання традыцый старажытнарускай матэрыяльнай культуры (Плавінскі 2020, с. 16—17). Характар гэтых адносін у кожным мікрарэгіёне заходняга памежжа КСПДК патрабуе асобнага дэталёвага разгляду. У Мілтах да ліку імпартных прадметаў матэрыяльнай культуры варта аднесці шкляныя пацеркі (курганы 4 і 13 групы I), шырокасярэдзінны пярсцёнак (курган 4 групы I), гузікі і масіўныя бронзавыя фібулы з курганоў 1 і 2 групы II.

Асобна варта спыніцца на факце выяўлення інгумацыі ў кургане 10 групы I. Здзяйсненне такога пахавання ў некропалі КСПДК магло адбыцца не раней за канец X — пачатак XI ст. і, відавочна, можа быць звязанае з пачаткам распаўсюджання хрысціянскай пахавальнай традыцыі ў Беларускім Падзвінні і сумежных рэгіёнах. Адпаведна, храналагічна яно з’яўляецца адным з самых позніх у некропалі. Асобныя інгумацыі ў могільніках КСПДК былі неаднаразова выяўленыя ў заходніх мікрарэгіёнах распаўсюджання помнікаў гэтай этна-культурнай супольнасці і маркіруюць фінальную стадыю функцыянавання яе некропаляў (Плавінскі 2017, с. 160—178).

Такім чынам, даследаваныя ў 1992—1993 гг. курганы ў групах I і II могільніка Мілты могуць быць датаваныя другой паловай X — першай паловай XI ст., ці некалькі шырэй — X — першай паловай XI ст., і належаць да фінальнага этапу існавання культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў на заходнім памежжы яе арэалу.

## ЛІТАРАТУРА

Авдусина, С. А., Ениосова, Н. В. 2001. Подковообразные фибулы Гнёздова. *Труды ГИМ*, 124: Археологический сборник. Гнёздово. 125 лет исследования памятника, с. 93-101.

Войтехович, А. В. 2019. *Погребальный обряд населения Полоцкой земли в X—XII вв.* Минск: Беларуская навука.

Горюнова, В. М. 2016. *Городок на Ловати X—XII вв. (к проблеме становления города Северной Руси).* Санкт-Петербург: Дмитрий Буланин.

Енуков, В. В. 1990. *Ранние этапы формирования смоленско-полоцких кривичей (по археологическим материалам).* Москва: КГПУ.

Енуков, В. В. 2018. Культура смоленских длинных курганов и древности днепро-донской лесостепи. *Труды исторического факультета МГУ*, 140: Серия II: Исторические исследования, 83: Археология Древней Руси: проблемы и открытия. Материалы международной конференции, посвященной 100-летию со дня рождения Д. А. Авдусина, с. 82-83.

Еремеев, И. И., Дзюба, О. Ф. 2010. *Очерки исторической географии лесной части Пути из варяг в греки. Археологические и палеогеографические исследования между Западной Двиной и озером Ильмень.* Санкт-Петербург: Нестор-История.

Еремеев, И. И. 2015. *Древности Полоцкой земли в историческом изучении Восточно-Балтийского региона (очерки средневековой археологии истории Псковско-Белорусского Подвинья).* Санкт-Петербург: Дмитрий Буланин.

Захаров, С. Д., Кузина, И. Н. 2008. Изделия из стекла и каменные бусы. В: Захаров С. Д. (ред.). *Археология севернорусской деревни X—XIII веков: средневековые поселения и могильники на Кубенском озере.* 2: Материальная культура и хронология. Москва: Наука, с. 142-215.

Каменецкая, Е. В. 2019. *Керамика IX—XIII вв. как источник по истории Смоленского Поднепровья.* Москва; Смоленск: КДУ; Университетская книга.

Лесман, Ю. М. 1984. Погребальные памятники Новгородской земли и Новгород (проблема синхронизации). В: Лебедев, Г. С. (ред.). *Археологические исследования Новгородской земли.* Ленинград: ЛГУ, с. 118-182.

Лопатин, Н. В., Фурасьев, А. Г. 2007. *Северные рубежи раннеславянского мира в III—V вв.* Раннеславянский мир, 8. Москва: ИА РАН.

Малевская-Малевич, М. В. 2005. *Керамика западнорусских городов X—XIII вв.* Санкт-Петербург: Нестор-История.

Мальм, В. А. 1967. Подковообразные и кольцевидные застежки-фибулы. *Труды ГИМ*, 43: Очерки по истории русской деревни X—XIII вв., с. 149-190.

Минасян, Р. С. 1980. Четыре группы ножей Восточной Европы эпохи раннего Средневековья (к вопросу о появлении славянских форм в лесной зоне). *Археологический сборник Государственного Эрмитажа*, 21, с. 68-74.

Митрофанов, А. Г. 1978. *Железный век средней Белоруссии (VII—VI вв. до н. э. — VIII в. н. э.).* Минск: Наука и техника.

Михайлов, К. А. 2016a. *Элитарный погребальный обряд Древней Руси: камерные погребения IX — начала XI века в контексте североевропейских аналогий.* Санкт-Петербург: Бранко.

Михайлов, К. А. 2016b. Костюм из псковских камерных погребений 2-й пол. X в. на фоне ранне-

средневековых европейских аналогий. В: Лабутина, И. К. (ред.). *Древнерусский некрополь Пскова X — начала XI века.* II: Камерные погребения древнего Пскова (по материалам археологических раскопок 2003—2009 гг. у Старовознесенского монастыря). Санкт-Петербург: Нестор-История, с. 415-427.

Михайлова, Е. Р. 2014. *Вещевой комплекс культуры псковских длинных курганов: типология и хронология.* Saarbrücken.

Нефёдов, В. С. 2000. О времени возникновения культуры смоленско-полоцких длинных курганов. *Археология и история Пскова и Псковской земли. Материалы научного семинара 1996—1999 гг.*, с. 191-199.

Нефёдов, В. С. 2002. Салтовские древности в смоленских длинных курганах. *Гістарычна-археалагічны зборнік*, 17, с. 131-139.

Нефёдов, В. С. 2012. Ранние этапы политогенеза на территории Смоленской земли (конец IX — первая половина XI в.). В: Захаров, С. Д. (ред.). *Северная Русь и проблемы формирования Древнерусского Государства: сборник материалов Международной научной конференции (Вологда — Кириллов — Белозерск, 6—8 июня 2012 г.).* Вологда: Древности Севера, с. 89-113.

Нукшинский… 1957. *Нукшинский могильник.* Материалы и исследования по археологии Латвийской ССР. Рига: АН Латвийской ССР.

Плавінскі, А., Плавінскі, М. 2005. Раскопкі курганнага могільніка Мілты. *Гістарычна-археалагічны зборнік*, 20, с. 122-130.

Плавінскі, А. Плавінскі, М. Тарасевіч, В. 2020. Раскопкі некропаля Наўры II у 2017 годзе. В: Плавінскі, М. А., Сідаровіч, В. М. (ред.). *Экспедыцыя працягласцю жыццё: зборнік навуковых артыкулаў памяці Аляксандра Плавінскага.* Мінск: Галіяфы.

Плавінскі, М. А. 2017. *Курганны могільнік Пагошча ў кантэксце сінхронных старажытнасцяў Браслаўскага Паазер'я.* Мінск: А. М. Яушкевіч.

Плавінскі, М. А. 2020. У пошуках новых поглядаў на гісторыю крывічоў Беларускага Падзвіння. *Беларускі гістарычны часопіс*, 5, с. 12-18.

Плавінскі, М. А., Дучыц, Л. У., Плавінскі, А. М., Шадыра, В. І. 2014. *Курганныя могільнікі захаду Браслаўскага Паазер'я (матэрыялы раскопак 1978—2010 гадоў).* Мінск: Галіяфы.

Плавинский, Н. А. 2011. Керамика курганного могильника Погоща и некоторые вопросы хронологии погребальной посуды северо-запада Полоцкой земли. *Археология и история Пскова и Псковской земли. Семинар им. академика В. В. Седова: Материалы 56-го заседания.* Москва; Псков, с. 263-273.

Плавинский, Н. А. 2018. Курганный могильник Навры в верховьях Вилии (по материалам раскопок 2012 и 2015 годов). *Археология и история Пскова и Псковской земли. Семинар им. академика В. В. Седова: Материалы 62-го заседания*, 32. Москва, с. 320-340.

Пушкина, Т. А. 1973. Лепная керамика Гнездовского селища. *Вестник Московского университета*, Серия IX: История, 3, с. 87-92.

Самойлович, Н. Г. 2006. Стеклянные бусы Ростова Великого. В: Кашкин, А. В. (ред.). *Археология Верхнего Поволжья (к 80-летию К. И. Комарова).* Москва: ИА РАН, с. 371-386.

Седова, М. В. 1981. *Ювелирные изделия древнего Новгорода (X—XV вв.).* Москва: Наука.

Степанова, М. И., Плавинский, Н. А. 2018. К вопросу о месте бус в погребальном костюме населения Верхнего Повилья в конце X—XII в. *Археология и история Пскова и Псковской земли: Ежегодник семинара им. академика В. В. Седова. Материалы 63-го заседания (2017 г.)*, 33. Москва; Псков, с. 275-287.

Фехнер, М. В. 1959. К вопросу об экономических связях древнерусской деревни. *Труды ГИМ*, 33: Очерки по истории русской деревни X—XIII вв., с. 149-224.

Френкель, Я. В. 2007. Опыт датирования пойменной части Гнёздовского поселения на основании анализа коллекции стеклянных и каменных бус (по материалам раскопок 1999—2003 гг.). В: Мурашева, В. В. (ред.). *Гнёздово. Результаты комплексных исследований памятника.* Санкт-Петербург, с. 78-117.

Хвощинская, Н. В. 2004. *Финны на западе Новгородской земли (по материалам могильника Залахтовье).* Санкт-Петербург: Дмитрий Буланин.

Шадыра, В. І. 2006. *Беларускае Падзвінне (І тысячагоддзе н. э.).* Мінск: Інстытут гісторыі НАН Беларусі.

Штыхаў, Г. В. 1992. *Крывічы: Па матэрыялах раскопак курганоў у Паўночнай Беларусі.* Мінск: Навука і тэхніка.

Штыхов, Г. В. 1992. Круговая керамика Полоцкой земли X—XI вв. в сравнительном изучении. В: Плетнева, С. А. (ред.). *Древнерусская керамика.* Москва: ИА РАН, с. 61-72.

Щапова, Ю. Л. 1956. Стеклянные бусы Древнего Новгорода. *Материалы и исследования по археологии СССР*, 55. Москва: АН СССР, с. 164-179.

Arbman, H. 1943. *Birka I. Die Gräber. Tafeln.* Stockholm: Kungl. Vitterhets Historie och Antikvitets Akademien.

Blujienė, A. 1999. *Vikingų epochos Kuršių papuošalų ornamentika.* Vilnius: Diemedžio.

Lietuvos… 1977. *Lietuvos TSR archeologijos atlasas.* 4: I—XIII radiniai. Vilnius: Mokslas.

Thunmark-Nulén, L. 1998. *Die Wikingerziet Gotlands.* II: Typentafeln. Stockholm: Kungl. Vitterhets Historie och Antikvitets Akademien.

## REFERENCES

Avdusina, S. A., Eniosova, N. V. 2001. Podkovoobraznye fibuly Gnezdova. *Trudy GIM*, 124: Arkheologicheskii sbornik. Gnezdovo. 125 let issledovaniia pamiatnika, s. 93-101.

Voitekhovich, A. V. 2019. *Pogrebalnyi obriad naseleniia Polotckoi zemli v X—XII vv.* Minsk: Belaruskaia navuka.

Goriunova, V. M. 2016. *Gorodok na Lovati X—XII vv. (k probleme stanovleniia goroda Severnoi Rusi).* Sankt-Peterburg: Dmitrii Bulanin.

Enukov, V. V. 1990. *Rannie etapy formirovaniia smolensko-polotckikh krivichei (po arkheologicheskim materialam).* Moskva: KGPU.

Enukov, V. V. 2018. Kultura smolenskikh dlinnykh kurganov i drevnosti dnepro-donskoi lesostepi. *Trudy istoricheskogo fakulteta MGU*, 140: Seriia II: Istoricheskie issledovaniia, 83: Arkheologiia Drevnei Rusi: problemy i otkrytiia. Materialy mezhdunarodnoi konferentcii, posviashchennoi 100-letiiu so dnia rozhdeniia D. A. Avdusina, s. 82-83.

Eremeev, I. I., Dziuba, O. F. 2010. *Ocherki istoricheskoi geografii lesnoi chasti Puti iz variag v greki. Arkheologicheskie i paleogeograficheskie issledovaniia mezhdu Zapadnoi Dvinoi i ozerom Ilmen.* Sankt-Peterburg: Nestor-Istoriia.

Eremeev, I. I. 2015. *Drevnosti Polotckoi zemli v istoricheskom izuchenii Vostochno-Baltiiskogo regiona (ocherki srednevekovoi arkheologii istorii Pskovsko-Belorusskogo Podvinia).* Sankt-Peterburg: Dmitrii Bulanin.

Zakharov, S. D., Kuzina, I. N. 2008. Izdeliia iz stekla i kamennye busy. In: Zakharov S. D. (ed.). *Arkheologiia severnorusskoi derevni X—XIII vekov: srednevekovye poseleniia i mogilniki na Kubenskom ozere.* 2: Materialnaia kultura i khronologiia. Moskva: Nauka, s. 142-215.

Kamenetckaia, E. V. 2019. *Keramika IX—XIII vv. kak istochnik po istorii Smolenskogo Podneprovia.* Moskva; Smolensk: KDU; Universitetskaia kniga.

Lesman, Iu. M. 1984. Pogrebalnye pamiatniki Novgorodskoi zemli i Novgorod (problema sinkhronizatcii). In: Lebedev, G. S. (ed.). *Arkheologicheskie issledovaniia Novgorodskoi zemli.* Leningrad: LGU, s. 118-182.

Lopatin, N. V., Furasev, A. G. 2007. *Severnye rubezhi ranneslavianskogo mira v III—V vv.* Ranneslavianskii mir, 8. Moskva: IA RAN.

Malevskaia-Malevich, M. V. 2005. *Keramika zapadnorusskikh gorodov X—XIII vv.* Sankt-Peterburg: Nestor-Istoriia.

Malm, V. A. 1967. Podkovoobraznye i koltcevidnye zastezhki-fibuly. *Trudy GIM*, 43: Ocherki po istorii russkoi derevni X—XIII vv., s. 149-190.

Minasian, R. S. 1980. Chetyre gruppy nozhei Vostochnoi Evropy epokhi rannego Srednevekovia (k voprosu o poiavlenii slavianskikh form v lesnoi zone). *Arkheologicheskii sbornik Gosudarstvennogo Ermitazha*, 21, s. 68-74.

Mitrofanov, A. G. 1978. *Zheleznyi vek srednei Belorussii (VII—VI vv. do n. e. — VIII v. n. e.).* Minsk: Nauka i tekhnika.

Mikhailov, K. A. 2016a. *Elitarnyi pogrebalnyi obriad Drevnei Rusi: kamernye pogrebeniia IX — nachala XI veka v kontekste severoevropeiskikh analogii.* Sankt-Peterburg: Branko.

Mikhailov, K. A. 2016b. Kostium iz pskovskikh kamernykh pogrebenii 2-i pol. X v. na fone rannesrednevekovykh evropeiskikh analogii. In: Labutina, I. K. (ed.). *Drevnerusskii nekropol Pskova X — nachala XI veka.* II: Kamernye pogrebeniia drevnego Pskova (po materialam arkheologicheskikh raskopok 2003—2009 gg. u Starovoznesenskogo monastyria). Sankt-Peterburg: Nestor-Istoriia, s. 415-427.

Mikhailova, E. R. 2014. *Veshchevoi kompleks kultury pskovskikh dlinnykh kurganov: tipologiia i khronologiia.* Saarbrücken.

Nefedov, V. S. 2000. O vremeni vozniknoveniia kultury smolensko-polotckikh dlinnykh kurganov. *Arkheologiia i istoriia Pskova i Pskovskoi zemli. Materialy nauchnogo seminara 1996—1999 gg.*, s. 191-199.

Nefedov, V. S. 2002. Saltovskie drevnosti v smolenskikh dlinnykh kurganakh. *Histaryčna-archiealahičny zbornik*, 17, s. 131-139.

Nefedov, V. S. 2012. Rannie etapy politogeneza na territorii Smolenskoi zemli (konetc IX — pervaia polovina XI v.). In: Zakharov, S. D. (ed.). *Severnaia Rus i problemy formirovaniia Drevnerusskogo Gosudarstva: sbornik materialov Mezhdunarodnoi nauchnoi konferentcii (Vologda — Kirillov — Belozersk, 6—8 iiunia 2012 g.).* Vologda: Drevnosti Severa, s. 89-113.

Nukshinskii... 1957. *Nukshinskii mogilnik. Materialy i issledovaniia po arkheologii Latviiskoi SSR.* Riga: AN Latviiskoi SSR.

Plavinski, A., Plavinski, M. 2005. Raskopki kurhannaha mohiĺnika Milty. *Histaryčna-archiealahičny zbornik*, 20, s. 122-130.

Plavinski, A. Plavinski, M. Tarasievič, V. 2020. Raskopki niekropalia Naŭry II u 2017 hodzie. In: Plavinski, M. A., Sidarovič, V. M. (ed). *Ekspiedycyja praciahlasciu žyccio: zbornik navukovych artykulaŭ pamiaci Aliaksandra Plavinskaha.* Minsk: Halijafy.

Plavinski, M. A. 2017. *Kurhanny mohiĺnik Pahošča ŭ kantekscie sinchronnych staražytnasciaŭ Braslaŭskaha Paazierja.* Minsk: A. M. Januškievič.

Plavinski, M. A. 2020. U pošukach novych pohliadaŭ na historyju kryvičoŭ Bielaruskaha Padzvinnia. *Bielaruski histaryčny časopis,* 5, s. 12-18.

Plavinski, M. A., Dučyc, L. U., Plavinski, A. M., Šadyra, V. I. 2014. *Kurhannyja mohiĺniki zachadu Braslaŭskaha Paazierja (materyjaly raskopak 1978—2010 hadoŭ).* Minsk: Halijafy.

Plavinskii, N. A. 2011. Keramika kurgannogo mogilnika Pogoshcha i nekotorye voprosy khronologii pogrebalnoi posudy severo-zapada Polotckoi zemli. *Arkheologiia i istoriia Pskova i Pskovskoi zemli. Seminar im. akademika V. V. Sedova: Materialy 56-go zasedaniia.* Moskva; Pskov, s. 263-273.

Plavinskii, N. A. 2018. Kurgannyi mogilnik Navry v verkhoviakh Vilii (po materialam raskopok 2012 i 2015 godov). *Arkheologiia i istoriia Pskova i Pskovskoi zemli. Seminar im. akademika V. V. Sedova: Materialy 62-go zasedaniia*, 32. Moskva, s. 320-340.

Pushkina, T. A. 1973. Lepnaia keramika Gnezdovskogo selishcha. *Vestnik Moskovskogo universiteta*, Seriia IX: Istoriia, 3, s. 87-92.

Samoilovich, N. G. 2006. Stekliannye busy Rostova Velikogo. In: Kashkin, A. V. (ed.). *Arkheologiia Verkhnego Povolzhia (k 80-letiiu K. I. Komarova).* Moskva: IA RAN, s. 371-386.

Sedova, M. V. 1981. *Iuvelirnye izdeliia drevnego Novgoroda (X—XV vv.).* Moskva: Nauka.

Stepanova, M. I., Plavinskii, N. A. 2018. K voprosu o meste bus v pogrebalnom kostiume naseleniia Verkhnego Povilia v kontce X—XII v. *Arkheologiia i istoriia Pskova i Pskovskoi zemli: Ezhegodnik seminara im. akademika V. V. Sedova. Materialy 63-go zasedaniia (2017 g.)*, 33. Moskva; Pskov, s. 275-287.

Fekhner, M. V. 1959. K voprosu ob ekonomicheskikh sviaziakh drevnerusskoi derevni. *Trudy GIM*, 33: Ocherki po istorii russkoi derevni X—XIII vv., s. 149-224.

Frenkel, Ia. V. 2007. Opyt datirovaniia poimennoi chasti Gnezdovskogo poseleniia na osnovanii analiza kollektcii stekliannykh i kamennykh bus (po materialam raskopok 1999—2003 gg.). In: Murasheva, V. V. (ed.). *Gnezdovo. Rezultaty kompleksnykh issledovanii pamiatnika.* Sankt-Peterburg, s. 78-117.

Khvoshchinskaia, N. V. 2004. *Finny na zapade Novgorodskoi zemli (po materialam mogilnika Zalakhtove).* Sankt-Peterburg: Dmitrii Bulanin.

Šadyra, V. I. 2006. *Bielaruskaje Padzvinnie (I tysiačahoddzie n. e.).* Minsk: Instytut historyi NAN Bielarusi.

Štychaŭ, H. V. 1992. *Kryvičy: Pa materyjalach raskopak kurhanoŭ u Paŭnočnaj Bielarusi.* Minsk: Navuka i technika.

Shtykhov, G. V. 1992. Krugovaia keramika Polotckoi zemli X—XI vv. v sravnitelnom izuchenii. In: Pletneva, S. A. (ed.). *Drevnerusskaia keramika.* Moskva: IA RAN, s. 61-72.

Shchapova, Iu. L. 1956. *Stekliannye busy Drevnego Novgoroda.* Materialy i issledovaniia po arkheologii SSSR, 55. Moskva: AN SSSR, s. 164-179.

Arbman, H. 1943. *Birka I. Die Gräber. Tafeln.* Stockholm: Kungl. Vitterhets Historie och Antikvitets Akademien.

Blujienė, A. 1999. *Vikingų epochos Kuršių papuošslų ornamentika.* Vilnius: Diemedžio.

Lietuvos... 1977. *Lietuvos TSR archeologijos atlasas.* 4: I—XIII radiniai. Vilnius: Mokslas.

Thunmark-Nulén, L. 1998. *Die Wikingerziet Gotlands.* II: Typentafeln. Stockholm: Kungl. Vitterhets Historie och Antikvitets Akademien.

*M. A. Plavinski*

## DATING AND CULTURAL IDENTITY OF THE MILTY BARROW CEMETERY (MIADZIEL DISTRICT MINSK REGION)

The barrow cemetery Milty consists of two groups — Milty I and II. The research of the cemetery was carried out in 1992—1993 by archaeological expedition of the historical faculty of the Belarusian State University under the head of V. N. Rabcevič and A. M. Plavinski. In 1992, 5 barrows in group Milty I were investigated, in 1993 — 2 barrows in group Milty II.

An analysis of the grave goods and rituals of the investigated burials suggests that the barrows in groups I and II of Milty cemetery can be dated to the second half of the $10^{th}$ — first half of the $11^{th}$ century, or somewhat more broadly, from the $10^{th}$ to the first half of the $11^{th}$ century. They belong to the final stage of the existence of the culture of the Smolensk-Polatsk Long Barrows culture on the western border of its area. At this time, glass beads, jewelry and household items

of Old Rusian types appeared in noticeable quantities in the burials of the western regions of the settlement of the population of the Smolensk-Polatsk Long Barrows culture.

In barrow 10 of group I, an inhumation burial was found. Such a burial in the necropolis of the Smolensk-Polatsk Long Barrows culture could have been performed not earlier than the end of the 10th — early 11th centuries and, obviously, may be associated with the beginning of the spread of the Christian burial tradition in the Belarusian Dzvina and adjacent territories. Accordingly, chronologically, it is one of the latest in the necropolis. Individual inhumations in the cemeteries of the culture of the Smolensk-Polatsk Long Barrows culture were repeatedly revealed in the western microregions of the distribution of monuments of this ethnocultural community and mark the final stage of the functioning of its necropolises.

**Keywords:** Early Middle Ages, Northern Belarus, burial rite, grave goods, of Smolensk-Polatsk Long Barrows culture.

*М. О. Плавінскі*

## ДАТУВАННЯ І КУЛЬТУРНА ПРИНАЛЕЖНІСТЬ КУРГАННОГО МОГИЛЬНИКА МІЛТИ (МЯДЕЛЬСЬКИЙ РАЙОН МІНСЬКОЇ ОБЛАСТІ)

Курганний могильник Мілти Мядельского району Мінської області складається з двох груп — Мілти I і II. Дослідження могильника проводилися в 1992—1993 рр. археологічною експедицією історичного факультету Білоруського державного університету під керівництвом В. Н. Рябцевіча і О. М. Плавінского. У 1992 р було досліджено 5 курганів в групі Мілти I, в 1993 р. — 2 кургану в групі Мілти II.

Аналіз поховального інвентарю та обряду досліджених поховань дозволяє стверджувати, що кургани в групах I і II могильника Мілти можуть бути датовані другою половиною X — першою половиною XI ст. або трохи ширше — X — першою половиною XI ст., і належать до фінального етапу існування культури смоленсько-полоцких довгих курганів на західному кордоні її ареалу. В цей час в похованнях західних регіонах розселення носіїв культури смоленсько-полоцких довгих курганів в помітній кількості з'являються скляні намиста, ювелірні прикраси і предмети побуту давньоруських типів.

У кургані 10 групи I було виявлено поховання за обрядом ингумации. Вчинення такого поховання в некрополі культури смоленсько-полоцких довгих курганів могло бути зроблено не раніше кінця X — початку XI ст. і, очевидно, може бути пов'язане з початком поширення християнської поховальної традиції в Білоруському Подвинье і суміжних територіях. Відповідно, хронологічно воно є одним з найбільш пізніх в некрополі. Окремі ингумации в могильниках культури смоленсько-полоцких довгих курганів були неодноразово виявлені в західних мікрорегіонах поширення пам'яток цієї етнокультурної спільності і маркують фінальну стадію функціонування її некрополів.

**Ключові слова:** раннє Середньовіччя, Північна Білорусь, поховальний обряд, поховальний інвентар, культура смоленсько-полоцких довгих курганів.

*Одержано 17.12.2020*

**ПЛАВІНСКІ Миколай Олександрович**, кандидат історичних наук, доцент, завідувач кафедрою, Білруський державний університет, Мінск, Білорусь.
**PLAVINSKI Mikalai**, Ph. D., Associate Professor, Head of Department, the Belarusian State University, Minsk, Belarus.
ORCID: 0000-0002-0660-7298, e-mail: plavinsky_arc@mail.ru.